## Паважаныя калегі!

Дапаможнік змяшчае распрацоўкі паўрочных планаў для 10 класа на II паўгоддзе навучальнага года і мае на мэце дапамагчы настаўніку ў наладжванні адукацыйнага працэсу. Метадычныя матэрыялы распрацаваны згодна з абноўленым зместам адукацыі, вучэбнай праграмай па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для X класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання (НІА, 2020), вучэбным дапаможнікам (Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 10 кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з белар. і рус. мовамі навучання / А. П. Бязлепкіна-Чарнякевіч [і інш.]; пад рэд. А. П. Бязлепкінай-Чарнякевіч, І. Д. Воюш. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2020). Планы-канспекты ўрокаў размеркаваны адпаведна прыкладнаму каляндарна-тэматычнаму планаванню (2021).

Сістэма прапанаваных урокаў спрыяе паўнацэннаму ўспрыманню вучнямі мастацкага тэксту ў агульным, а таксама разуменню мікратэм і падтэксту. Праблемныя пытанні дазваляюць зацікавіць, стварыць праблемную сітуацыю, што садзейнічае раскрыццю зместу і асноўнай думкі твора.

Значная ўвага надзяляецца асэнсаванаму чытанню, аналізу і сінтэзу прапанаванага навучальнага матэрыялу. Апорныя схемы, табліцы, карты, дыяграмы і іншыя наглядныя дапаможнікі дазваляюць фарміраваць у вучняў уменні сістэматызаваць, аналізаваць, параўноўваць і рабіць вывады.

Планы-канспекты змяшчаюць заданні, якія фарміруюць і рэалізуюць міжпрадметныя сувязі, пабудаваныя на веданні беларускай музыкі, скульптуры, мастацтва кіно.

У дапамогу настаўніку ў планы-канспекты ўрокаў уключаны дадатак са спасылкай на гугл-дыск з мастацкімі творамі і ілюстрацыямі, QR-коды са спасылкамі на відэафільмы і музычныя творы.

Распрацаваныя ўрокі садзейнічаюць рэалізацыі выхаваўчага патэнцыялу ўрокаў літаратуры, фарміраванню духоўна-маральных каштоўнасцей.

Метадычныя распрацоўкі носяць рэкамендацыйны характар і разлічаны на творчае выкарыстанне. Настаўнік можа ўносіць карэктывы з улікам магчымасцей, узроўню падрыхтаванасці класа, а таксама індывідуальных асаблівасцей кожнага вучня.

*С. Ю. Кампанеец*

# УРОК 27

## Змітрок Бядуля. Апавяданне «Бондар»

**Мэта:** мяркуецца, што вучні запомняць асноўныя факты з біяграфіі Змітрака Бядулі; абгрунтуюць жанр твора і складуць план апавядання; прааналізуюць вобраз галоўнага героя; ахарактарызуюць стаўленне іншых герояў да Данілы; вызначыць мастацкую адметнасць апавядання «Бондар».

**Задачы развіцця і выхавання асобы вучняў:** стварыць умовы для фарміравання і развіцця ўмення працаваць з тэкстам; аналізаваць, структураваць і параўноўваць інфармацыю; выказваць і аргументаваць свае думкі; садзейнічаць выхаванню эмпатыі, асуджэння эстэтычнай неразвітасці, чэрствасці і абыякавасці.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік па беларускай літаратуры для 10 класа; апавяданне «Бондар» Змітрака Бядулі; выявы: санкі, фотаздымак Максіма Багдановіча, скульптура Заіра Азгура «Сымон-музыка»; дыдактычны раздатачны матэрыял.

### Ход урока

### I. Арыенціровачна-матывацыйны этап.

**❖ Арганізацыйны момант. Стварэнне псіхалагічнага настрою.**

— Што яднае прапанаваныя выявы *(санкі, скульптура ў Мінску Заіра Азгура «Сымон-музыка», партрэт Максіма Багдановіча.)*







(*Вучні выказваюць свае думкі і меркаванні. Добра, калі погляды супярэчлівыя. У выніку размовы настаўнік павінен падвесці іх да думкі, што яднае гэтыя выявы талент. Талент патрэбен, каб зрабіць такую рэч з дрэва, талентам быў надзелены Сымон-музыка, загадку таленту Максіма Багдановіча разгадваем да сённяшняга дня.*)

❖ **Праблемнае пытанне.**

— Як вы думаеце, талент — гэта дар Бога ці яго пакаранне? (*Настаўнік слухае, прымае першапачатковыя меркаванні вучняў і пакідае пытанне адкрытым.*)

❖ **Мэтавызначэнне.**

— Сёння на ўроку мы будзем гаварыць пра талент Змітрака Бядулі. Больш падрабязна спынімся на яго апавяданні «Бондар». Прапаную вам вызначыць мэты нашага ўрока. (*Настаўнік выслухоўвае прапановы і разам з вучнямі фармулюе мэты ўрока.*) Спадзяюся, што напрыканцы ўрока вы зможаце:

- запомніць (2-3-4) факты з біяграфіі Змітрака Бядулі;
- абгрунтаваць жанр твора і скласці план;
- прааналізаваць вобраз галоўнага героя твора;
- ахарактарызаваць стаўленне іншых герояў да Данілы;
- вызначыць мастацкую адметнасць апавядання «Бондар».

## II. Аперацыйна-пазнавальны этап.

❖ **Франтальная гутарка.**

— Звярніцеся да стужкі часу. (*У раздрукаваным варыянце прапанавана вучням.*) На ёй размешчаны вызначальныя даты ў біяграфіі Змітрака Бядулі. Абапіраючыся на веды па гісторыі, назавіце падзеі, якія змянілі жыццё ўсёй краіны. Як яны, на вашу думку, адбіліся на біяграфіі пісьменніка?



***Фізкультхвілінка.***

***Праца ў групах.***

*(Клас дзеліцца на 4 групы. Кожная група запаўняе і пасля агучвае звесткі толькі па адной даце ў жыцці паэта. Пры адказе групы вучні слухаюць і запаўняюць калонкі. Вучні карыстаюцца матэрыялам вучэбнага дапаможніка, с. 162—163.)*

❖ **Слова настаўніка.**

— А вы ведалі, што ў сям'і Змітрака Бядулі ўсе валодалі нейкім рамяством? Маці шыла каптуры, дзед Лейзар рабіў меднае начынне — імбрыкі, конаўкі чарпакі і місы. Ды і сам Змітрок падзарабляў разьбой па дрэве. Выразаў для аднакласнікаў пеналы, скрынкі, нават цацачныя скрыпачкі. Таму невыпадкова з-пад яго пяра выйшаў твор «Бондар». [3, с. 161]

❖ **Праца ў групах.**

***1 група.***

Дакажыце, што жанр твора «Бондар» — апавяданне. Складзіце цытатны план твора і абгрунтуйце свой выбар.

*Даведка:*

**Апавяданне** — празаічны твор, які грунтуецца на адным эпізодзе, раскрываецца характар аднаго персанажа.

*Прыкладны адказ:*

*1. «Стары Даніла славіўся на цэлую ваколіцу сваімі вырабамі...»*

*2. «Даніла рыхтуецца да новай цікавай працы».*

*3. «...Пані пажадала мець у сваёй гаспадарцы хвалёную работу "залатых рук" Данілы».*

*4. «Даніла гарэў на сваім уласным агні. Даніла лез усё вышэй і вышэй па невідочнай лесвіцы».*

*5. «Гэта былі не вёдры, не начоўкі, не лыжкі, а дзіўны сон пекных форм».*

*6. «Яго скінулі з гары ў глыбокую яму».*

***2 група.***

«Амаль усе таленты хоць кропельку паэты, нават сталяры, калі яны таленавітыя» (*Фёдар Дастаеўскі*).

— Ці пагаджаецеся вы з выказваннем Ф. Дастаеўскага? Падмацуйце яго цытату прыкладамі з тэксту апавядання Змітрака Бядулі. Адказ аформіце ў выглядзе табліцы.

*Прыкладны адказ:*

| Герой | Цытатная характарыстыка героя | Уласныя высновы |
|---|---|---|
| Даніла | *Меў «залатыя рукі»; «мэтай яго жыцця былі не заробкі, а праца сама па сабе...»; «І ён песціў у сваім сэрцы агромную радасць творчасці...»; «Трэба так працаваць, каб рук і плеч не чуць, каб сэрца млела, каб пот цурком ліўся...»; «Вось хто яго ўрэшце зразумее і ацэніць».* | *Бондар славіцца сваімі вырабамі, працуе не для матэрыяльнага заробку, праца для яго — гэта творчасць, якая прыносіць вялікае шчасце. Чакае прызнання свайго таленту ад асобы больш культурнай — пані.* |

***3 група.***

«Для прызнання таленту патрэбен талент прызнання» (*Уладзімір Галабародзька*).

— Як вы разумееце гэта выказванне? Складзіце кластар «Сувязь вобраза Данілы з іншымі персанажамі». Пракаменціруйце, якія адносіны звязваюць герояў.

*Прыкладны адказ:*

| **Даніла** | | |
|---|---|---|
| ↓ | ↓ | ↓ |
| **Аўдоцця** | **Пані** | **Сяляне** |
| *Яна як цень свайго мужа: добра разумее бондара, дагаджае ва ўсім, можа падтрымаць і ацаніць работу мастака. Даніла па-свойму любіць яе, цэніць яе падтрымку.* | *На пані мы глядзім вачыма Данілы, які спадзяецца, што яна ацэніць яго работу, «угледзіць дарагі скарб там, дзе ён папраўдзе ёсць». На самой справе пані не звярнула ўвагі на вырабы Данілы. Ставіцца да яго работы пагардліва.* | *Ахвотна набываюць вырабы Данілы, пасвойму цэняць яго працу, сваімі размовамі часта раздражняюць яго. Шкадуюць, што нікога не навучыў свайму рамяству. Як дакор, нязграбная, шурпатая труна для майстра.* |

***4 група.***

Знайдзіце мастацкія тропы ў апавяданні, занатуйце ў табліцу. Вызначце іх ролю ў творы.

## Спіс выкарыстаных крыніц


**1.** *Астрэйка, А.* Цвіціце, верасы! Вершы / А. Астрэйка. — Мн.: Маст. літ., 1975. — 176 с.

**2.** Беларуская камедыя XX стагоддзя: Для сярэд. і ст. шк. узросту / Маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн.: Выш. шк., 1998. — 384 с.: іл. — (Школьная бібліятэка).

**3.** Беларуская літаратура: вучэб. дапаможнік для 10 класа ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання (з электронным дадаткам для павышанага ўзроўню) / А. П. Бязлепкіна-Чарнякевіч [і інш.]. — Мн.: НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2020. — 294 с.

**4.** Беларускія пісьменнікі (1917—1990) : даведнік / склад. А. К. Гардзіцкі; навук. рэд. А. Л. Верабей. — Мн.: Маст. літ., 1994. — 348 с.

**5.** *Броўка, П.* Збор твораў у чатырох тамах. Т. II. Вершы і паэмы. 1941—1950 гг. / П. Броўка. — Мн.: Беларусь, 1965. — 456 с.

**6.** *Броўка, П.* Збор твораў у чатырох тамах. Т. III. Вершы і паэмы. 1952—1965 гг. / П. Броўка. — Мн.: Беларусь, 1966. — 680 с.

**7.** Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Беларуская літаратура» для X класа ўстаноў адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання (базавы ўзровень) // Учебные программы по учебным предметам для учреждений общего среднего образования с русским языком обучения и воспитания. X класс (базовый уровень). — Мн.: НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2020. — С. 12—28.

**8.** *Вярцінскі, А.* Выбраныя творы / Анатоль Вярцінскі; Уклад., камент. А. Вярцінскага; прадм. В. Русілкі. — Мн.: Кнігазбор, 2009. — 528 с. — («Беларускі кнігазбор»: Серыя 1. Мастацкая літаратура).

**9.** *Дубоўка У.* О Беларусь, мая шыпшына...: Выбранае / У. Дубоўка; [уклад. Д. М. Давідоўскага, З. К. Пазняк (У. Шэкспір. Санеты); маст. А. І. Цароў]. — Мн.: Маст. літ., 2002. — 319 с. — (Беларуская паэзія XX стагоддзя).

**10.** Единый информационно-образовательный ресурс // Общее среднее образование [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://eior.by/. — Дата доступу: 14.09.2021.

**11.** Зборнік твораў 1920 — сярэдзіны 1960-х гг.: проза, паэзія: для старэйшага школьнага ўзросту. — Мн.: Беларусь, 2012. — 400 с. — (Школьная бібліятэка).

**12.** Краіну родную люблю: зб. паэзіі: для ст. шк. узросту / укладанне: Мікола Мінзер. — Мн.: Літаратура і Мастацтва, 2010. — 280 с. — (Школьная бібліятэка).

**13.** *Крапіва, К.* Збор твораў. У 4 т. Том 2. Проза / К. Крапіва. — Мн.: Дзяржвыд БССР, 1963. — 416 с.

**14.** *Куляшоў, А.* Выбраныя творы / А. Куляшоў; уклад., прадм. В. Куляшовай. — Мн.: Маст. літ., 2009. — 206 с. — (Школьная бібліятэка).

**15.** *Міхнёнак, С. С.* Беларуская мова і літаратура. 10 клас. Прыкладнае каляндарна-тэматычнае планаванне: дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / С. С. Міхнёнак, В. І. Караткевіч. — Мн.: НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2021. — 139 с. — (Бібліятэка настаўніка).

**16.** *Панчанка, П.* Выбранае / П. Панчанка. — Мн.: Маст. літ., 1975. — 496 с.

**17.** *Панчанка, П.* Выбраныя творы: для ст. шк. узросту / П. Панчанка; уклад. В. Шніп. — Мн.: Маст. літ., 2009. — 238 с. — (Школьная бібліятэка).

**18.** *Старычонак, В. Дз.* Як правільна пісаць сачыненні па беларускай мове і літаратуры (у дапамогу абітурыентам і школьнікам) / В. Дз. Старычонак. — Гродна: Выд. Ілюшы В. Мельнікава, 1997. — 31 с.

**19.** *Сурначоў, М.* Ліст да маці / М. Сурначоў // Беларуская палічка [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://knihi.com/Mikola_Surnacou/List_da_maci.html. — Дата доступу: 20.09.2021.

**20.** *Танк, М.* Збор твораў. У 13 т. Т. 2. Вершы (1939—1954) / М. Танк; НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы; рэд. тома Д. Я. Бугаёў; падрыхт. тэкстаў і камент. С. У. Калядка. — Мн.: Беларуская навука, 2006. — 566 с.

**21.** *Танк, М.* Збор твораў. У 13 т. Т. 3. Вершы (1954—1964) / М. Танк; НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы; рэд. тома В. П. Рагойша; падрыхт. тэкстаў і камент. С. У. Калядка, В. У. Карачун. — Мн.: Беларуская навука, 2007. — 447 с.

**22.** *Танк, М.* Ты яшчэ толькі намёк на чалавека... / М. Танк // Паэтычная старонка Максіма Танка [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://maksimtank.ru/vershy/ty-yashche-tolki-namek-na-chalaveka. — Дата доступу: 18.09.2021.

**23.** *Чорны, К.* Выбраныя творы / К. Чорны; уклад. і прадм. М. Тычыны; камент. М. Тычына, Я. Янушкевіч. — Мн.: Беллітфонд, 2000. — 608 с., [2] л. іл.

## Змест

*Ад аўтара* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 1

Урок 27. Змітрок Бядуля. Апавяданне «Бондар» . . . . . . . . . . 2

Урок 28. Уладзімір Дубоўка. Вершы «О Беларусь, мая шыпшына», «Залатая асенняя раніца...», «Родная мова, цудоўная мова!» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 7

Урок 29. Кандрат Крапіва. Звесткі пра жыццё і творчасць. Камедыя «Хто смяецца апошнім» . . . . . . . . . . . . . . . . . . 13

Урок 30. Кандрат Крапіва. Вобразная сістэма камедыі «Хто смяецца апошнім» . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18

Урок 31. Сачыненне-разважанне па адной з прапанаваных тэм: «Хто ж смяецца апошнім?», «Ці састарэлі героі Кандрата Крапівы?», «Ці бывае зло маленькім?» . . . . . . . . . . . 24

Урок 32. Міхась Зарэцкі. Апавяданне «Дзіўная» . . . . . . . . . . . 26

Урок 33. Беларуская літаратура перыяду Вялікай Айчыннай вайны (1941—1945). Агляд . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 32

Урок 34. Агляд творчасці Петруся Броўкі перыяду Вялікай Айчыннай вайны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 37

Урок 35. Ваенная лірыка Аркадзя Куляшова . . . . . . . . . . . . . . . 43

Урок 36. Адметнасць лірыкі Максіма Танка перыяду Вялікай Айчыннай вайны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 48

Урок 37. Кузьма Чорны. Раман «Пошукі будучыні»: сацыяльна-філасофскі змест, асаблівасці сюжэтна-кампазіцыйнай будовы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 52

Урокі 38—39. Раман «Пошукі будучыні»: асаблівасці вобразнай сістэмы, тэматыка, праблематыка, пафас . . . . . . . . . . 56

Урок 40. Стылявыя адметнасці творчасці і псіхалагізм у прозе Кузьмы Чорнага . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 61

Урок 41. Сачыненне-разважанне па адной з прапанаваных тэм: «Ці цяжка быць маладым?», «Будучыня Беларусі вачыма сучаснай моладзі», «Ці лёгкі шлях здрадніка?» . . . . 65

Урок 42. Беларуская літаратура пасляваенных дзесяцігоддзяў (1945—1965). Агляд . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 67

Урок 43. Пімен Панчанка. Верш «Герой» . . . . . . . . . . . . . . . . . 71

Урок 44. Пімен Панчанка. Вершы «Родная мова», «Той дзень прапаў і страчаны навекі...», «Спарышы», «Крык сойкі» . . . 76
Урок 45. Дадатковае чытанне. Андрэ Маруа «Пакаранне золатам» . . 81
Урок 46. Іван Мележ. Раман «Людзі на балоце»: творчая гісторыя, тэматыка і праблематыка . . . . . . . . . . . . . 87
Урок 47. Нацыянальныя характары ў рамане. Вобразы Васіля Дзятла, Ганны Чарнушкі і Яўхіма Глушака . . . . . . . . . 92
Урок 48. Нетрадыцыйны падыход да раскрыцця псіхалогіі заможных сялян . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 96
Урок 49. Нацыянальная самабытнасць творчасці Івана Мележа і яе агульначалавечы характар . . . . . . . . . . . . . . . . 101
Урок 50. Сачыненне-разважанне па адной з прапанаваных тэм: «Паміж дрыгвой і грэбляй (адлюстраванне прыходу новага жыцця ў рамане "Людзі на балоце")», «Васіль ці Ганна: чыю жыццёвую пазіцыю я падтрымліваю», «У чым драматызм лёсу старога Глушака?» . . . . . . . . . . . . . . . 105
Урок 51. Дадатковае чытанне. Міхась Зарэцкі «Кветка пажоўклая» . . 107
Урок 52. Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год . . . . . . . 113
Урок 53. Рэзерв вучэбнага часу . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 116
*Дадатак* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 117
*Спіс выкарыстаных крыніц* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 145

Зак. 35/2711319-1.